Назва ТВП: Балота Марочна

© С. Левый

Код: BY034

Геаграфічныя каардынаты: 51°51' N 26°36' E

Адміністрацыйная прыналежнасць: Брэсцкая вобласць: Столінскі раён

Плошча: 12514 га

Крытэрыі: B2, B3

Нацыянальны прыродаахоўны статус: : частка тэррыторыі ТВП адносіцца да біялагічных заказнікаў мясцовага значэння «Морачна» (плошча 5283 га) і «Ступскае» (655 га)

Міжнародны прыродаахоўны статус: ТВП рэгіянальнага значэння, утворана ў 2005 годзе

Агульнае апісанне:

Балота Марочна – адно з трох буйнейшых верхавых балот, якія захаваліся ў натуральным стане на Палессі пасля асушальнай меліярацыі. Гэта самае старажытнае балота Беларусі – яго фарміраванне пачалося каля 10 тысяч гадоў назад. Паўднёвая і заходняя часткі балота, маюць трансгранічны характар (размешчаны ў межах Беларусі і Украіны).

Большасць балотных масіваў, якія знаходзяцца навокал яго, зараз асушана для здабычы торфу.

Марочна – тыповае верхавое балота, якое знаходзіцца на водападзеле. У яго не ўпадае ніводнай рэчкі, і воднае забеспячэнне ажыццяўляецца за кошт атмасферных ападкаў. Амаль з усіх бакоў балота абкружана лясамі. Па краях балота размешчана некалькі масіваў унікальных старых ельнікаў. Іх цэннасць заключаецца ў тым, што яны ўяўляюць сабой абасобленыя астравы на значнай адлегласці ад мяжы суцэльнага распаўсюджання елкі. Ва ўсходняй і цэнтральнай частках балота знаходзіцца шэраг буйных парослых лесам мінеральных астравоў. Таўшчыня тарфяной залежы больш 2 метраў. Пераважаюць верхавы і пераходны тыпы балот.

На большай частцы балота гідралагічны рэжым блізкі да натуральнага – узровень грунтовых вод у гады з сярэдняй колькасцю ападкаў, блізкі да нуля, а яго ваганні складаюць + 20 см. У пачатку 1950-х гадоў на балоце было пракопана некалькі асушальных каналаў агульнай даўжынёй каля 20 км, якія да нашага часу паспяхова дрэнуюць балота. У паўночнай частцы балота гідралагічны рэжым цалкам парушаны ў выніку здабычы торфу.

У 1920-1930-я гады, па сведчаннях польскіх даследчыкаў, балота было пераважна адкрытым. Пасля пракладання каналаў яно пачало інтэнсіўна зарастаць балотнай сасной, і ў наш час найбольш значныя для біяразнастайнасці адкрытыя бязлесныя ўчасткі захаваліся толькі ў паўднёва-усходняй частцы балотнага масіву.

У складзе флоры выяўлена 5 відаў дзеразы, 6 хвашчоў, 8 папаратнікаў, 3 голанасенных і 527 пакрытанасенных раслін.

Збор журавін на адным з буйнейшых журавіннікаў — балоце Марочна, — з’яўляецца важнай крыніцай прыбытку для больш чым 5000 сем’яў, якія жывуць у навакольных вёсках.

Асноўныя біятопы:

Верхавыя балоты – 50%, лясы (пераважна сасновыя) – 45%, іншыя землі – 5%.

Птушкі:

112 відаў птушак (100 відаў гняздуюцца, 12 адзначаюцца пад час міграцыі).

Прыродаахоўная каштоўнасць угоддзя вызначаецца, у першую чаргу, наяўнасцю на гнездаванні шэрагу рэдкіх і ахоўваемых відаў птушак, якія занесены ў нацыянальную Чырвоную кнігу і маюць высокі еўрапейскі ахоўны статус (SPEC): шэры журавель *Grus grus*, чорны бусел *Ciconia nigra*, палявы лунь *Circus cyaneus*, арол-вужаед *Circaetus gallicus*, сокал-пустальга *Falco tinnunculus*, сокал-кабец *Falco subbuteo*, вялікі грыцук *Limosa limosa*, вялікі кулён *Numenius arquata*, беласпінны *Dendrocopos leucotos* і жоўтагаловы *Picoides tridactylus* дятлы.

Іншыя групы жывел:

Адзначана 30 відаў млекакормячых, 7 — паўзуноў і 8 – земнаводных. У межах балотнага масіву і па яго перыферыі адзначаны амаль усе буйныя абарыгенныя капытныя – лось *Alces alces*, дзік *Sus scrofa* і казуля *Capreolus capreolus*. Іх колькасць невысокая, што абумоўлена асаблівасцямі біяцэнатычнай структуры гэтай тэрыторыі. У ельніках, якія прымыкаюць да балота, адзначаны рэдкі для Палескага рэгіёна заяц-бяляк *Lepus timidus*. Такім чынам, тэрыторыя з’яўляецца адным з самых паўднёвых участкаў распаўсюджання гэтага віду.

З ахоўваемых у Беларусі жывёл зарэгістраваны еўрапейская рысь *Felis linx*, барсук *Meles meles*, балотная чарапаха *Emys orbicularis* і мядзянка *Coronella austriaca*. Даволі верагодным выглядае і пражыванне ў заказніку ахоўваемых відаў кажаноў, аднак даследаванні гэтай групы млекакормячых не праводзіліся.

Стан рэдкіх відаў птушак:

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды (2006-2010)	Крытерый ТВП
Чорны бусел *Ciconia nigra*	гн	+	2006	П		
Арол-вужаед *Circaetus gallicus*	гн	4-6 п	2010-2011	Э	↔	B2
Лунь палявы *Circus cyaneus*	гн	+	2006	П		

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды (2006-2010)	Крытерый ТВП
Сокал-пустальга *Falco tinnunculus*	гн	+	2006	П		
Сокал-кабец *Falco subbuteo*	гн	+	2006	П		
Грыцук вялікі *Limosa limosa*	гн	2-5 п	2010	Э		
Кулён вялікі *Numenius arquata*	гн	2-5 п	2010-2011	Э	↓	
Ляляк звычайны *Caprimulgus europaeus*	гн	350-500 с	2006	Э	↔	В3
Дзяцел беласпінны *Dendrocopos leucotos*	гн	+	2006	П		
Дзяцел жоўтагаловы *Picoides tridactylus*	гн	+	2006	П		

Іншыя рэдкія і знаходзячыеся пад пагрозай знікнення віды:

Расліны: кадзіла сармацкае *Mellitis sarmatica*, мнаганожка звычайная *Polypodium vulgare*, лікападыела заліваемая *Lycopodiella inundata*, жаўтазель германскі *Genista germanica*, расніца прамежкавая *Drosera intermedia*, асака малакветкавая *Carex pauciflora*, вярба чарнічная *Salix myrtilloides*, журавіны дробнаплодныя *Oxycoccusmicrocarpus*, хамарбія балотная *Hammarbyapaludosa*.

Пагрозы:

Асноўнымі неспрыяльнымі фактарамі, якія ўздзейнічаюць на натуральныя прыродныя супольніцтвы ўгоддзя, з’яўляюцца здабыча торфу, звязаннае з ім змяненне гідралагічнага рэжыму, пажары і высечка лясоў.

Торфараспрацоўка і змяненне гідралагічнага рэжыму.

З поўначы да ўгоддзя прымыкае ўчастак торфапрадпрыемства «Глінка». У бліжэйшы час да яго плануецца далучыць яшчэ дзве пляцоўкі агульнай плошай 160 га і буферную зону плошчай 40 га, якая будзе непасрэдна прылягаць да межаў патэнцыяльнай ТВП. Глыбіня меліярацыйных каналаў па перыметру торфараспрацоўкі складае 3-3,5 м, шырыня – 4,0-5 м. У вясенне-летні перыяд узровень вады ў іх на 2,5 м ніжэй паверхні глебы.

Асушэнне тэрыторыі ў выніку работы торфапрадпрыемства прывяло да цэлага шэрагу адмоўных вынікаў: на плошчы каля 500 га адбылася замена асакова-сфагнавых асацыяцый верасовымі.На ўсім балотным масіве значна знізілася колькасць цецерука; амаль цалкам зніклі калоніі вялікага кулёна (у 1980 г. — 45 пар, у 2003 г. – 3 пары); на парушанай тэрыторыі зніклі ахоўваемыя віды птушак – шэры журавель, малы арлец і арол-вужаед, звычайныя ў аналагічных натуральных біятопах на поўдні масіва.На трансфармаваных участках практычна цалкам зніклі рэліктавыя травяністыя асацыяцыі шэйхцэрыі балотнай і чаротніка белага, а таксама рэдкая і ахоўваемая ў Беларусі асака малакветкавая, у той час як у натуральных балотных біятопах яны па-ранейшаму сустракаюцца. Асабліва моцна дэградзіравала балотная расліннасць у 100-метровай паласе ўздоўж торфапляцоўкі. Высыханне верхняга слою глебы месцамі прывяло да ўтварэння адкрытых, цалкам пазбаўленных травяністай расліннасці ўчасткаў.

Высечка лясоў.

Высокаўзроставыя лясы, перспектыўныя ў сэнсе высечкі, размешчаны альбо па перыферыі балотнага масіву, альбо па астравах сярод балота. Гэтыя лясы з’яўляюцца рэзерватамі для цэлага шэрагу рэдкіх відаў жывёл і раслін, што неабходна ўлічваць пры вядзенні гаспадарчай дзейнасці.

Пажары на тэрыторыі балотнага масіву адносяцца да адной з найбольш істотных пагроз. За апошнія дзесяцігоддзі яны ўзнікалі тут даволі рэгулярна і ахоплівалі плошчы ў некалькі соцень гектараў. Пажары прывялі да высыхання сасны на балоце, месцамі да парушэння наглебавага покрыва, і, адпаведна, да

зніжэння біялагічнай разнастайнасці. Асноўная прычына ўзнікнення тарфяных пажараў – зніжэнне ўзроўню грунтовых вод.

Рэкамендацыі па захаванню:

Спыненне працы торфапрадпрыемства “Глінка”, льбо пераарыентацыя яго працы на перапрацозку сухой расліннасці, і вербалозу і выраб з гэтых нявычырпальных крыніц сыравіны пелет.

Абмежаванне высечкі стараўзроставых лясоў, у першую чаргу яловых.

Усталяванне спецыяльнаг рэжыму аховы месцаў гнездавання ахоўваемых відаў.

Вярубванне хмызнякоў і дрэў ў месцах дзе захаваліся адкрытыя балоты.

Акрамя таго, неабходна распрацаваць і рэалізаваць мерапрыемствы, накіраваныя на аптымізацыю гідралагічнага рэжыму ўгоддзя і выключэння негатыўнага ўплыву на яго торфазадабычы, а таксама правесці паўторнае забалочванне выпрацаваных тарфянікаў.

Крыніцы інфармацыі:

Асабістыя паведамленні: Абрамчук А.В., Груммо Д.Г., Зеленкевич Н.А., Кіцель Д., Левы С.В., Скуратович А.Н., Созинов О.В.

Скарбы прыроды Беларусі. – Мн.: Беларусь, 2005. – 215 с. (Інфармацыю падрыхтавалі: Вазняк Н.Л., Дамброўскі В.Ч., Жураўлёў Д.В., Казулін А.В., Максіменкаў М.В., Скуратовіч А.М.).

Складальнікі : Абрамчук А.В., Левы С.В.

---

* *Выкарыстанне змешчанай тут неапублікаванай інфармацыі для навуковых публікацый без пісьмовай згоды яе аўтараў забаронена. У выпадку выкарыстання часткі кантэнту або старонкі цалкам на іншых інтэрнет-рэсурсах, абавязковая спасылка на аўтараў і сайт iba.ptushki.org*